Быць адважнымі для Хрыста

Аўтар: кл. Вадзім Каўтанюк
31.05.2015 01:00



20–21 мая Гродзенскую вышэйшую духоўную семінарыю наведаў Яго Эксцэленцыя ксёндз арцыбіскуп Хорхе Карлас Патрон Вонг, сакратар Кангрэгацыі па справах духавенства ў Ватыкане. “Быць адважнымі для Хрыста, каб спаўняць Яго волю – вось да чаго мы ўсе пакліканы”, – падкрэсліў арцыбіскуп падчас святой Імшы ў семінарыйнай капліцы. “Еднасць нашага паклікання і служэнне Богу і людзям павінна быць галоўнай мэтай нашай фармацыі”, – дадаў ён.

Падчас свайго візіту ксёндз арцыбіскуп прыняў удзел у маёвым набажэнстве ў семінарыйнай капліцы, у святой Імшы, а таксама двойчы сустрэўся з выхаваўцамі і клерыкамі ў канферэнц-зале. Пытанні, якія падымаліся падчас сустрэч, былі вельмі розныя, але датычыліся аднаго – фармацыі клерыкаў у гродзенскай семінарыі. †



Навучэнцы Гродзенскай ВДС вельмі цёпла сустрэлі пасланніка Ватыкана і нават падрыхтавалі яму песню на іспанскай мове. Таксама падчас развітання з арцыбіскупам на падворку семінарыі не сціхала гітара і спеў.

Арцыбіскуп Хорхе аказаўся вельмі “сучасным” чалавекам: ён самастойна вядзе акаўнты ў Інстаграме, Фэйсбуку і Твітары, а таксама робіць сэлфі (фотаздымкі ад першай асобы) з семінарыстамі са ўсяго свету. Так, за месяц май ксёндз арцыбіскуп наведаў чатыры кантыненты.

“Хачу, каб вы памяталі, што вы не адзінокія, па ўсім свеце я сустракаюся з клерыкамі розных семінарый – у Афрыцы, Аўстраліі, ЗША, Еўропе, Лацінскай Амерыцы. Вас усіх яднае супольная місія – радаснае служэнне Хрысту і абвяшчэнне Яго Евангелля”, –

сказаў арцыбіскуп падчас агульнай сустрэчы з клерыкамі.

Пасля ад'езду Яго Эксцэленцыі ў хуткім часе з'явіўся запіс у Твітары, дзе ксёнз арцыбіскуп шчыра дзякаваў за адкрытасць, добры і радасны настрой, які стварылі яму клерыкі нашай семінарыі.

Юбілейныя ўрачыстасці з нагоды 25-годдзя семінарыі ў Гродне 17 чэрвеня адбудуцзя з часу заснавання Вышэйша

П раграма:

9.30 – прывітанне гасцей і ўступнае слова (рэктар ВДС

•кароткая справаздача з дзейнасці семінарыі на працягу 25 гадоў (прэфект кс. Віталій Сідорка
•спеў хору;
•прамова біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча;
•прамовы сяброў і дабрачынцаў ВДС у Гродне;

12.00 – святая Імша ў касцёле Узвышэння Святога Крыжа

13.45 – абед;

15.00 – асвячэнне і адкрыццё памятнай дошкі (зала св. Ян

•уручэнне памятных кніг і дыпломаў дабрачынцам ВДС;
•канцэрт музычнага гурта "AVE" і святочная кава;
•заканчэнне.

Да ўдзелу ва ўрачыстасцях запрошаны святары-выпускнікі ВДС у Гр